ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
1 лістапада 2006 г. № 34

# АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ ІНСТРУКЦЫІ АБ ПАРАДКУ СТВАРЭННЯ І АДКРЫЦЦЯ ЭКСПАЗІЦЫЙ І ВЫСТАВАК МУЗЕЯЎ

У адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 13 Закона Рэспублікі Беларусь ад 12 снежня 2005 года «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Зацвердзіць Інструкцыю аб парадку стварэння і адкрыцця экспазіцый і выставак музеяў (дадаецца).

Міністр У.Ф.Матвейчук

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
01.11.2006 № 34

## ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку стварэння і адкрыцця экспазіцый і выставак музеяў

### ГЛАВА 1
### АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная Інструкцыя распрацавана ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 12 снежня 2005 года «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2005 г., № 197, 2/1167) і вызначае парадак стварэння і адкрыцця экспазіцый і выставак музеяў.

2. У дадзенай Інструкцыі выкарыстоўваюцца наступныя тэрміны і іх вызначэнні:

экспазіцыя - мэтанакіраваная і навукова абгрунтаваная дэманстрацыя музейных прадметаў і (або) музейных калекцый з уласных фондаў музея, якія арганізаваны кампазіцыйна, суправаджаюцца пісьмовым каментарыем, тэхнічна і мастацка афармленыя і ў выніку ствараюць спецыфічны музейны вобраз пэўных прыродных і (або) грамадскіх з’яў згодна з профілем музея;

выстаўка - сукупнасць музейных прадметаў і (або) прадметаў музейнага значэння, аб’яднаных адной тэмай як з уласных фондаў, так і з фондаў іншых музеяў і прыватных калекцый, выстаўленых на пэўны тэрмін для агляду наведвальнікамі музея.

3. Дадзеная Інструкцыя з’яўляецца абавязковай для ўсіх дзяржаўных музеяў, а таксама для прыватных музеяў, калі іншы парадак не ўстаноўлены ўласнікам музея.

## ГЛАВА 2
## СТВАРЭННЕ І АДКРЫЦЦЁ ЭКСПАЗІЦЫЙ МУЗЕЯЎ

4. Стварэнне экспазіцый з’яўляецца вынікам навукова-даследчай працы музея і адным з асноўных відаў музейнай дзейнасці.

5. Этапамі для стварэння экспазіцыі з’яўляюцца:

5.1. распрацоўка навукова-праектнай дакументацыі:

пісьмовай навуковай канцэпцыі з абгрунтаваннем асноўнай ідэі, мэтаў і задач экспазіцыі, вызначэннем шляхоў іх увасаблення;

тэматычнай структуры экспазіцыі, тэматыка-экспазіцыйнага плана і сцэнарыя экспазіцыі;

5.2. распрацоўка архітэктурна-мастацкага рашэння;

5.3. мантаж экспазіцыі.

6. Стварэнне экспазіцыі і распрацоўка навукова-праектнай дакументацыі ажыццяўляюцца рабочай групай, якая зацвярджаецца загадам кіраўніка музея ці юрыдычнай асобы, структурным падраздзяленнем якой з’яўляецца музей. Гэтым жа загадам вызначаюцца тэрміны пачатку і заканчэння работы, прызначаецца кіраўнік групы.

У музеях з абмежаваным штатам навуковых супрацоўнікаў дапускаецца падрыхтоўка навукова-праектнай дакументацыі для стварэння пастаяннай экспазіцыі музейнымі работнікамі з вядучых музеяў краіны ці навуковымі работнікамі навукова-даследчых устаноў Рэспублікі Беларусь па дагаворы.

7. Падрыхтаваная навукова-праектная дакументацыя абмяркоўваецца на навукова-метадычным савеце музея і дасылаецца на рэцэнзаванне:

музеямі гарадскога і сельскага падпарадкавання - у дзяржаўны музей абласнога падпарадкавання адпаведнага профілю;

музеямі абласнога ці Мінскага гарадскога падпарадкавання - у дзяржаўны музей рэспубліканскага падпарадкавання адпаведнага профілю;

музеямі рэспубліканскага падпарадкавання - ва ўстанову адукацыі «Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры»;

музеямі, якія з’яўляюцца структурнымі падраздзяленнямі юрыдычных асоб, - у дзяржаўны музей абласнога ці рэспубліканскага падпарадкавання адпаведнага профілю.

8. Архітэктурна-мастацкае рашэнне выконваецца прафесійнымі дызайнерамі і мастакамі, якія знаходзяцца ў штаце музея, або адпаведнымі спецыялістамі па дагаворы.

9. Навукова-праектная дакументацыя пасля атрымання рэцэнзіі і падрыхтаванае архітэктурна-мастацкае рашэнне зацвярджаюцца

кіраўніком музея ці юрыдычнай асобы, структурным падраздзяленнем якой з’яўляецца музей.

10. Зацверджаныя навукова-праектная дакументацыя і архітэктурна-мастацкае рашэнне з’яўляюцца падставай для заключэння адпаведных дагавораў на мантаж экспазіцыі.

11. Далейшыя змяненні ў зацверджаную навукова-праектную дакументацыю і архітэктурна-мастацкае рашэнне могуць быць унесены толькі са згоды кіраўніка музея ці юрыдычнай асобы, структурным падраздзяленням якой з’яўляецца музей. Усе змяненні фіксуюцца дадаткамі да дагавора з выканаўцам.

12. Прыём экспазіцыі ажыццяўляецца камісіяй, якая прызначаецца загадам заснавальніка.

## ГЛАВА 3
## СТВАРЭННЕ І АДКРЫЦЦЁ ВЫСТАВАК

13. Для стварэння выставак музеямі распрацоўваецца наступная праектная дакументацыя:

13.1. калі тэрмін дэманстрацыі выстаўкі 1 месяц і болей:

сцэнарый выстаўкі альбо разгорнутая тэматычная структура;

архітэктурна-мастацкае рашэнне;

13.2. калі тэрмін дэманстрацыі выстаўкі менш за 1 месяц:

сцэнарый выстаўкі альбо разгорнутая тэматычная структура.

14. Праектная дакументацыя выстаўкі, разлічанай на тэрмін экспанавання 1 месяц і болей, альбо выстаўкі, якая рыхтуецца для дэманстрацыі за межамі музея, разглядаецца на навукова-метадычным савеце і зацвярджаецца кіраўніком музея ці юрыдычнай асобы, структурным падраздзяленням якой з’яўляецца музей.

Праектная дакументацыя выстаўкі, разлічанай на тэрмін экспанавання менш за 1 месяц, зацвярджаецца кіраўніком музея ці юрыдычнай асобы, структурным падраздзяленнем якой з’яўляецца музей.

15. Стварэнне выстаўкі ажыццяўляецца навукова-экспазіцыйным ці выставачным аддзелам музея альбо рабочай групай, якая зацвярджаецца загадам кіраўніка музея ці юрыдычнай асобы, структурным падраздзяленнем якой з’яўляецца музей. Гэтым жа загадам вызначаюцца тэрміны пачатку і заканчэння работы па стварэнню выстаўкі, прызначаецца кіраўнік групы.

16. План стварэння выставак з’яўляецца часткай перспектыўнага і гадавога плана дзейнасці музея.

17. Прыём выставак, разлічаных на тэрмін экспанавання больш за 1 месяц, ажыццяўляецца спецыяльнай камісіяй, прызначанай загадам кіраўніка музея ці юрыдычнай асобы, структурным падраздзяленнем якой з’яўляецца музей.